АСТРАВЕЦКАЯ ПРАЎДА






Вакзалы злучаюць і разводзяць людзей, становяцца маўклівымі сведкамі крыўдных спазненняў і шчаслівых лёсавызначальных сустрэч… А для кагосьці яны, як дарога і цягнік, – значная частка жыцця.




**АВГУСТ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| ПН | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| ВТ | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| СР | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| ЧТ | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| ПТ | 4 | | | 23 | 30 |
| СБ | | | | 24 | 31 |
| ВС | | | | 25 | |

## ДЕНЬ ЖЕЛЕЗНОДОРОЖНИКА

**Уважаемые работники и ветераны железнодорожного транспорта, примите искренние поздравления с профессиональным праздником!**

Сегодня трудно себе представить отрасль экономики, которая могла бы развиваться и выполнять свои задачи, не прибегая к услугам железнодорожного транспорта. Стальная магистраль давно стала неотъемлемой частью нашей повседневной жизни. Её социальное и экономической значение невозможно переоценить.

Благодаря вашему неустанному труду, мы с лёгкостью преодолеваем любые расстояния. По всей Беларуси и за пределы нашей страны перевозятся малые и большие грузы.

Особое значение имеет железная дорога и для жителей Островетчины, которые связали свою жизнь с этой отраслью. Профессиональная ответственность всех работников без исключения – будь то монтёр пути, машинист или начальник дороги – обеспечивает бесперебойное сообщение района с другими городами, высокий уровень безопасности и качество обслуживания в пути.

От всей души желаем вам дальнейших успехов, жизненного оптимизма, уверенности в своих силах, здоровья, счастья, удачи и благополучия.

**С.Т. Медзвецкас, председатель Островецкого районного исполнительного комитета.**
**Г.П. Бычко, председатель Островецкого районного Совета депутатов.**



**Пра рамантыку і кіламетры з'езджаных па чыгунцы дарог, нечаканыя здымкі ў кліпе напярэдадні прафесійнага свята ў адзін з прыездаў на радзіму расказала наша зямлячка з аграгарадка Варона Вольга Кардаш, якая 16 гадоў працуе праваднічай пасажырскага вагона ў Мінскім аддзяленні Беларускай чыгуначнай дарогі.**

# Праваднікцы дарога сніцца…

## Ад паездкі ў электрычцы да справы жыцця

Яшчэ ў школьныя гады дзяўчына неаднойчы чыгункай ездзіла ў сталіцу і назад: вагон набіраў хуткасць, а за акном мяняліся краявіды, на месца вясковых драўляных хат заступалі неабсяжныя хлебныя палі, густыя лясы, прыгарадныя вакзалы…

– Тады здавалася, што вось так бы ўсё жыццё ехала і ехала… Мне падабалася назіраць не толькі за тым, як мяняецца пейзаж, але і за людзьмі: хтосьці драмаў пасля напружанага працоўнага дня, іншыя, па ўсім бачна было, што студэнты, вярталіся дадому і абмяркоўвалі, як паздавалі залікі і экзамены, – узгадала суразмоўца адно са сваіх першых знаёмстваў з чыгункай і прагаварылася, што выбар на яе карысць зрабіла спантанна, але правільна.

Гэта маладая жанчына адчула пасля першай паездкі ў цягніку далёкага накіравання, і з гадамі яе ўпэўненасць толькі ўзмацнілася.

– Сяброўка, якая на той час працавала праваднічай, так захоплена і натхнёна расказвала пра работу, што я загарэлася ідэяй стаць праваднічай, – працягвае Вольга. – Паступіла ў Мінскі дзяржаўны чыгуначны каледж. Пасля яго заканчэння з 2008 года маё жыццё непарыўна звязана з чыгункай, за выключэннем двух дэкрэтных адпачынкаў. Цікава, што нас у групе было 30 чалавек, а ў прафесіі засталося толькі 3, у тым ліку я. Многія думаюць, што наша работа акружана арэолам рамантыкі, але насамрэч гэта спецыяльнасць не для кожнага. Па-першае, трэба быць ураўнаважаным, карэктным і ўсе асабістыя праблемы пакідаць па-за цягніком; па-другое, – у пэўнай ступені псіхолагам. У дарозе часта спрацоўвае праславуты эфект спадарожніка, калі чалавек вылівае табе сваю душу – і хочаш-не хочаш, а трэба яго выслухаць. Але наша работа дае непераўзыдзеную магчымасць не толькі ўбачыць розныя краіны і гарады, але і лепш зразумець людскую сутнасць, а яна, паверце, вельмі добра праяўляецца ў абмежаванай прасторы, тым больш калі ехаць некалькі сутак…

## Вагон – наш дом, а пасажыры – госці

У адрозненне ад офісных работнікаў, якія «жывуць» па раскладзе «пяцідзёнкі», праваднікі тыдзень працуюць, наступныя сем дзён адпачываюць. Праўда, у гэтым графіку часта бываюць выключэнні, асабліва ў калядныя і навагоднія святы і летам, на якое прыпадае пік адпачынкаў.

*„– Вагон для мяне, як дом, а пасажыры – госці, якіх трэба сустрэць, забяспечыць ім камфортныя ўмовы на працягу ўсяго шляху руху цягніка, – тлумачыць Вольга. – Мы апранаем не толькі форму, але і ўсмешкі. Да кожнага чалавека стараемся знайсці індывідуальны падыход, дапамагчы. За гады работы экстрэмальных сітуацый не было, хоць даводзілася аказваць першасную даўрачэбную дапамогу чалавеку, які зваліўся з верхняй лаўкі. Дзякаваць богу, усё абышлося без моцнага траўмавання. Здаралася, што са мной спрабавалі пазнаёміцца, некаторыя нават заляцаліся, але ўсе такія спробы адразу ж спыняю. У нас ёсць свая прафесійная этыка.*

Аказваецца, работа праважніка пачынаецца задоўга да адпраўлення саставу. Прыняць і прыбрацца ў вагоне, праверыць унутранае і вонкавае абсталяванне, падрыхтаваць пасцельную бялізну… І толькі позна вечарам, рассадзіўшы пасажыраў згодна купленым білетам, Вольга Кардаш прывітае іх сваёй бязменнай прамяністай усмешкай.

– Па шляху руху цягніка мы разносім чай, прапануўваем набыць сувенірную прадукцыю ці кандытарскія вырабы, стасуемся з пасажырамі, – расказвае пра працоўныя абавязкі праваднічка. – Цяпер цалкам запоўнены вагоны, шмат дадатковых рэйсаў: многія едуць адпачываць на Чорнае мора, а таксама на экскурсіі ў Санкт-Пецярбург ці Маскву. Дастаткова часта сустракаю ў цягніку і знаёмых з Астравеччыны.

Адзін з немалаважных аргументаў, якія прыводзіць Вольга Кардаш на карысць сваёй прафесіі, – гэта магчымасць пабываць у розных гарадах і ў вольны час палюбавацца прыгажосцю прыроды.

– Навасібірск, Мурманск, Сочы, Масква – аб'ездзіла Расію і ўсю Беларусь. Самы любімы рэйс – на Адлер. Неверагодна чароўныя і адрозныя ад нашых мясцін пейзажы. Перад вачыма і цяпер стаіць мора, уздоўж якога мы едзем каля 4-х гадзін. І гэтыя карціны за акном ніколі не прыядаюцца. Праўда, пагуляць па горадзе не атрымалася: стаіць цягнік там толькі некалькі гадзін. Затое спазнала абдымкі Чорнага мора ў Феадосіі: у нас была магчымасць прагуляцца па набярэжнай, акунуцца і палюбавацца неабсяжнасцю марскіх вод, – захоплена працягнула Вольга. – У апошні час працую на маршруце накірунку Мінск-Санкт-Пецярбург. Думаю, кожнага, хто бываў у паўночнай сталіцы Расіі, яна не пакінула раўнадушным. Унікальны горад па архітэктуры і атмасферы.

## Стасункі з віп-асобамі і здымкі ў кліпе ў рэжыме нон-стоп

Вольга Кардаш працавала і на «фірме» – так на мове чыгуначнікаў называюцца фірменныя цягнікі, дзе можна сустрэць шмат медыйных і публічных асоб.

– Сяргей Жукаў, Алег Газманаў, Ксенія Сітнік, Ірына Дарафеева – каго толькі з вядомых артыстаў айчыннай і расійскай эстрады «не перавозіла». Гэта людзі без завышаных патрабаванняў і зорнага прэйскуранта, як думаюць некаторыя. Як і звычайным пасажырам, так і ім прыйшоўся даспадобы традыцыйны чай у нязменнай гранёнай шклянцы ў важкім металічным падшклянніку, – з усмешкай заначае суразмоўца. – Але найбольш, напэўна, запомніўся гурт «Рождество», які ехаў на фірменным цягніку Мінск-Масква. Гэта было напачатку маёй работы на чыгунцы. Адкрытыя, энергічныя, простыя. А яшчэ ў дарозе яны здымалі невялікае відэа да свайго кліпа, мы з напарніцай там засвяціліся… Вазілі і спартсменаў, і замежнікаў. Стасавацца з апошнімі дапамагала базавае веданне англійскай мовы. Цяпер у асноўным рэйсы толькі на Расію.

## Пра асабістае

На сем дзён пасажырскі вагон становіцца для Вольгі домам, а наступны тыдзень яна ў родным доме ў Вароне адпачывае са сваімі хлопчыкамі.

– Пакуль я на рабоце, за сынамі прыглядае маці. З рэйсаў абавязкова прывожу ім магніты і розную смакату. Старэйшы Кірыл, які сёлета пойдзе ў 8-мы клас, неяк сказаў, што хоча стаць памочнікам машыніста. Магчыма, сын стане прадаўжальнікам маёй справы і калісьці яму, як і мне, будзе сніцца на доўгіх выхадных чыгунка…

### РЭПАРЦЁР ВЫХОДЗІЦЬ У СВЕТ

## Рэльсы-рэльсы, шпалы-шпалы…

**Упэўнена, што вынесены ў загаловак радок пра «поезд запоздалый» многія ведаюць з дзяцінства. А вось ці знаёмы з чыгункай і як даўно ёй карысталіся – пра гэта карэспандэнт «раёнкі» пацікавіўся ў астраўчан і гасцей горада.**

**Аліса Шадура, студэнтка:**



– Чыгункай карысталася не раз: ездзіла на электрычцы ў Мінск. *(Задумваецца.)* Шкада, што з Гудагая няма прамых цягнікоў да Гродна, мне здаецца, гэты маршрут карыстаўся б папулярнасцю ў жыхароў нашага рэгіёна, асабліва ў студэнтаў, улічваючы, што чыгуначны транспарт заўсёды быў таннейшым за аўтобусны.

**Яўген Гродзель, вадзіцель:**



– Шмат гадоў назад па справах ездзіў у Мінск на электрычцы. З Гудагая ў сталіцу можна даехаць без праблем, вырашыць справы і апошнім цягніком вярнуцца назад, тым больш што электрычкі ходзяць некалькі разоў на дзень. Але трэба прызнаць, што паездка на ўласным транспарце – гэта і эканомія часу, і больш зручная лагістыка.

**Таццяна Сцяблоўская, галоўны бухгалтар:**



– У пазамінулым годзе на хуткім цягніку ездзіла ў Маскву да сяброўкі. У белакаменнай была праз 6,5 гадзіны пасля выезду з Мінска. І праваднікі, і абслугоўванне, і сэрвіс на вышэйшым узроўні, хоць гэта састаў далёка не бізнес-класа. Адзінае, што засмуціла, дастаткова «куслівы» кошт на білет.

**Рамуальда Вако, пенсіянерка:**



– Памятаю той час, калі не было межаў, не патрэбны былі візы – і мы ездзілі на прыгарадным цягніку ў Вільнюс. Гэта было звыкла і натуральна для многіх жыхароў нашага раёна. Хоць састаў спыняўся на кожным прыпынку, але білет каштаваў капейкі.

**Іна Дзмітрыева, у дэкрэтным адпачынку (без фота):**

– На электрычках ад'ездзіла ўсё студэнцтва – вучылася ў Мінску. Летась, калі гасцілі ў бацькоў на Астравеччыне, вырашыла пазнаёміць шасцігадовага сына з чыгункай. *(Усміхаецца.)* Бацька падвёз нас у Гудагай на станцыю, адкуль мы выправіліся ў сталіцу. Словамі не перадаць эмоцыі, якія перапаўнялі Ягора. Ён, канешне, ведаў, як выглядае цягнік, але ўпершыню ў жыцці яго ўбачыў. Паездка сыну спадабалася. З мінусаў: шмат часу правялі ў дарозе, на машыне было б хутчэй.

**Матэрыялы старонкі падрыхтавала Алена ГАНУЛІЧ.**